Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 КРАСАВІКА 2014 г. ЧАЦВЕР № 61 (27671) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Плюсы і мінусы сумеснага жыцця з бацькамі

Сакрэт ураджайных сотак не ў колькасці ўгнаенняў

ПАДЗЕЯ ДНЯ

Учора, у адпаведнасці з 95-м артыкулам Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, адбылося адкрыццё чацвёртай сесіі Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

У першы дзень сесіі ніжняя палата разгледзела 14 пытанняў: з іх 10 законапраектаў, 3 пастановы Палаты прадстаўнікоў і адзін праект кодэкса. Дэпутат па Гомельскай-Навабеліцкай выбарчай акрузе Алена Астапюк выбрана членам Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы.

Падчас першага пасяджэння чацвёртай сесіі сенатары Савета Рэспублікі далі згоду на прызначэнне суддзяў Вярхоўнага Суда, разгледзелі пытанне аб датэрміновым спыненні паўнамоцтваў члена Савета Рэспублікі Валерыя Іванова, а таксама аб сумесным пасяджэнні палат парламента.

У першы дзень працы абедзве палаты сфарміравалі свае рабочыя органы — сакратарыят і падліковую камісію.

(Падрабязнасці на 2-4 стар.)

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 03.04.2014 г.

Долар ЗША	9900,00	▲
Еўра	13660,00	▲
Рас. руб.	281,00	▲
Укр. грыўня	868,42	▼

ISSN 1990 - 763X

ЗЯМЛЯ — АСНОВА ЎСЁЙ АЙЧЫНЕ

Фота БЕЛТА.

Сяўба ранніх яравых збожжавых і зернебабовых набліжаецца да завяршэння ў Гомельскай вобласці. У гаспадарках па стане на 1 красавіка засеяна раннімі яравымі збожжавымі і зернебабовымі каля 90% запланаваных плошчаў, прычым чатыры раёны цалкам завяршылі сяўбу гэтых культур. На апошніх гектарах вядзецца сяўба яравых збожжавых і ў адным з паўднёвых раёнаў Гомельшчыны — Добрушскім. На здымку: механізатар Сяргей Мельнікаў з аддзялення «Насовічы» ААТ «Чырвоная Буда» заняты на сяўбе яравога ячменю.

КРАІНЕ ПАТРЭБНА СУЧАСНАЯ АРМІЯ

Надыходзіць якасна новы этап развіцця абарончага комплексу

Учора Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка наведаў ААТ «558-ы Авіяцыйны рамонтны завод» у Баранавічах. Пра тое, што азнаямленне з абароннай вытворчасцю на гэтым прадпрыемстве адбудзецца ў хуткім часе, Прэзідэнт абяцаў журналістам падчас гутаркі з імі на выбарчым участку 23 сакавіка.

Сутнасцю новага этапу развіцця абарончага комплексу краіны, паводле слоў старшыні Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта Сяргея Гурулёва, з'яўляецца аснашчэнне самым сучасным узбраеннем, перш за ўсё, беларускай арміі, а таксама пастаўкі на знешні рынак. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што гэта можа служыць эпіграфам усяго мерапрыемства. «Армія сярэдзіны мінулага стагоддзя нам не патрэбна. Фронт на фронт мы не пойдзем. Нашай краіне патрэбна сучаснае войска, і яго асновай павінны стаць сілы спецыяльных аперацый, дэсантна-штурмавыя, ваенна-паветраныя сілы, а таксама СПА», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Сяргей Гурулёў далажыў, што ў сферы ВПК ёсць вялікая ўпэўненасць у выкананні вызначанага пяцігадовага плана. Ён падрабязна праінфармаваў аб далейшых планах па развіцці галіны, распрацоўцы новых відаў ўзбраення і ваеннай тэхнікі, аб'ёмах экспарту, якія выраслі.

СТАР. 4

■ Жыллёвае пытанне

ЧАРГАВІКОЎ СТАЛА НА 40 ТЫСЯЧ МЕНШ

На ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў напрыканцы мінулага года было зарэгістравана амаль 773 тыс. грамадзян (сем'яў), што на 40,6 тыс. менш, чым год таму, паведамілі спецыялісты Нацыянальнага статыстычнага камітэта.

Прычым сярод усіх жыллёвых чаргавікоў 90,1% — гэта гарадскія жыхары, а доля сельскіх — усяго толькі 9,9%.

Паводле падлікаў спецыялістаў, памяншэнне колькасці грамадзян, якія стаяць на такім уліку, адбылося ў асноўным за кошт адпаведнай тэндэнцыі ў Мінску (мінус 15,1 тыс. чалавек). Большая частка бесквартэрных прыпадае на маладыя сем'і — 354,5 тыс. (45,9%), патрэбу ў больш прасторным жыллі маюць 24,2 тыс. шматдзетных сем'яў (3,1%), а 20,1 тыс. грамадзян маюць права на атрыманне жылых памяшканняў сацыяльнага карыстання (2,6%). Напрыканцы мінулага года 154,6 тыс. грамадзян (сем'яў), або 20%, працягваюць стаяць на ўліку 10 і больш гадоў. Патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў маюць 123,5 тыс. (16%) чалавек (сем'яў), якія пражываюць у інтэрнатах, з іх больш за 10 гадоў — 34,8 тыс., 13,8 тыс. — у кватэрах з некалькімі наймальнікамі, а 1,9 тыс. — у дамах, якія прызнаны непрыдатнымі для пражывання.

У параўнанні з 2012 годам колькасць грамадзян (сем'яў), якія стаяць на ўліку 10 і больш гадоў, зменшылася на 10,6 тыс., а тых, якія пражываюць у інтэрнатах, — на 8,1 тыс.

Летась у нашай краіне атрымалі жыллё і палепшылі жыллёвыя ўмовы 38,7 тыс. чалавек, або 4,8% ад агульнай колькасці чаргавікоў. Сярод іх 16,6 тыс. маладых сем'яў, 4,6 тыс. шматдзетных сем'яў і 2,7 тыс. тых, хто мае права на атрыманне жылых памяшканняў сацыяльнага карыстання.

Сяргей КУРКАЧ.

■ Людзі і справы

ПОСПЕХІ Ў ЗОНЕ РЫЗЫКІ

Фота БЕЛТА.

Генеральны дырэктар СЗАТ «Сервалюкс» Яўген БАСКІН уваходзіць у склад міжведамаснай рабочай групы па рэфармаванні аграпрамысловага комплексу, якую ўзначальвае Прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч. Яўген Рафаілавіч падзяліўся з нашымі чытачамі сваімі меркаваннямі па гэтай праблеме.

СЁННЯ надышоў час паглядзець на сельскую гаспадарку не як на пастаяннага просьбіта бюджэтных рэсурсаў дзеля добрых мэт, а як на паўнавартаснага суб'екта эканомікі краіны, які мае сур'ёзны экспартны патэнцыял. У гэтым сэнсе павышэнне маржынальнасці і эфектыўнасці становіцца актуальным, лагічным і важным.

СТАР. 5